— зарегистрированные на территории Республики Беларусь колесные тракторы и самоходные машины;

— транспортные средства оперативного назначения; транспортные средства, используемые в целях обеспечения обороноспособности и правопорядка;

— маршрутные транспортные средства, осуществляющие городские перевозки пассажиров, а также транспортные средства, используемые в целях ликвидации чрезвычайных ситуаций или перевозок грузов гуманитарной помощи населению Республики Беларусь и других государств.

Указом Президента №349 **10.08**.2015 «О внесении изменений и дополнений в указы Президента Республики Беларусь» дополнен перечень таких транспортных средств, и к ним причислили «транспортные средства с технически допустимой общей массой не более 3,5 тонны, не зарегистрированные на территории государств — членов Евразийского экономического союза, ввезенные физическими лицами на таможенную территорию Евразийского экономического союза либо приобретенные физическими лицами на территории государств — членов Евразийского экономического союза и ввезенные на территорию Республики Беларусь, и буксируемые ими прицепы, — в течение 10 дней соответственно со дня их выпуска таможенными органами в целях обращения на таможенной территории Евразийского экономического союза без ограничений по пользованию и распоряжению либо со дня их приобретения».

Изменения вступили в силу после официального опубликования Указа — 13 августа 2015 года, — прокомментировал ситуацию юрист-эксперт Павел Сапелко.

Как видим, штраф в данном случае неправомерен.

Микола КОНОНОВИЧ

Уважаемые читатели!

В нашей газете работает рубрика «Ответы юриста». На Ваши вопросы ответят профессиональные юристы-эксперты. Присылать свои вопросы можете на адрес: 231800, г. Слоним, ул. Красноармейская, 41, на электронный адрес gazslon@gmail.com, в скайп mikola_by1 или в SMS-сообщении на номер +375 29 584-87-32.

НОВОСТИ

ПРОЖИТОЧНЫЙ МИНИМУМ БЕЛОРУСОВ С 1 НОЯБРЯ ПОНИЗИЛСЯ НА 0,1%

В Беларуси с 1 ноября 2015 года Постановлением Минтруда и соцзащиты установлен бюджет прожиточного минимума для основных социально-демографических групп населения:

— в среднем на душу населения — 1 567 810 рублей;

— для трудоспособного населения — 1 725 700 рублей;

— для пенсионеров — 1 195 080 рублей;

— для студентов — 1 515 120 рублей;

— для детей в возрасте до 3 лет — 1 007 190 рублей;

— для детей в возрасте от 3 до 6 лет — 1 405 460 рублей;

— для детей в возрасте от 6 до 18 лет — 1 720 030 рублей.

Новый БПМ уменьшился на 0,1% к нормативу, который действует с 1 августа по 31 октября текущего года (1 569 130 руб.).

Новые размеры минимальных бюджетов будут действовать с 1 ноября 2015 года по 31 января 2016 года, сообщает сайт ведомства.

Бюджет прожиточного минимума в среднем на душу населения в ценах сентября 2015 г. по сравнению с БПМ в ценах июня 2015 г. не увеличился, что обусловлено сентябрьским снижением цен на плодоовощную продукцию к июню — периоду реализации продукции нового урожая и значительным удельным весом данной статьи расходов в продуктах питания (22,5%).

На незначительное увеличение бюджета прожиточного минимума для некоторых социально-демографических групп населения повлияли различия в нормах потребления продуктов питания, их удельном весе в структуре расходов на продовольственные товары.



Анна ВОЛОДАЩУК

ПАМЯЦЬ

НАШ КАЛЯНДАР

Восенню людзі звычайна вынікі падводзяць і рахункі... З першых Дзядоў у Мінску ў 1988 годзе не люблю гэты восеньскі час. Тады ўпершыню на ўласнай скуры адчуў, што бальшавіцкія рахункі з беларусамі ў канцы 30-х гадоў XX стагоддзя адгукаюцца нам і па сёння.

29 кастрычніка 1937 года

Расстраляныя ў засценках НКУС у Мінску беларускія пісьменнікі, навукоўцы і грамадскія дзеячы. Сярод забітых — Платон Галавач, беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч; Хацкель Дунец, беларуска-жыдоўскі пісьменнік; Алесь Дудар (сапр. Дайлідовіч), беларускі паэт, крытык; Міхась Зарэцкі (сапр. Касянкоў), беларускі пісьменнік; Васіль Каваль (сапр. Кавалёў), беларускі пісьменнік, журналіст; Валеры Маракоў, беларускі паэт; Васіль Сташэўскі, беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч, удзельнік Слуцкага паўстання; Міхась Чарот (сапр. Кудзелька), беларускі паэт, грамадска-культурніцкі дзеяч... Усяго ў ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў Мінску былі расстраляныя 132 чалавекі: беларускія літаратары, навукоўцы, грамадскія дзеячы. Хто іх сёння помніць?



Першыя Дзяды ў Мінску, 30.10.1988

30 кастрычніка 1988 года

На першых восеньскіх Дзядах у Мінску спіс рэпрасаваных і расстраляных беларускіх пісьменнікаў каля помніка Янку Купалу ўпершыню ў навейшай гісторыі Беларусі публічна зачытваў паэт Анатоль Сыс. Мурашкі тады прабягалі па целе ад яго голасу. Пазней другі беларускі паэт і даследчык беларускай літаратуры Міхась Скобла назаве тое, што адбывалася восенню 1937 года ва ўнутранай турме НКУС і Курапатах расстралянай. Але расстраляная ў 30-я была не толькі беларуская літаратура — бальшавікі расстралялі перспектыву хуткага фармавання беларускай нацыі.

30 кастрычніка 1988 года міліцыя і КДБ разганялі нас, удзельнікаў тых першых Дзядоў, дубінкамі і слезацечным газам. Анатоль Сыс, якога літаральна пасвілі, каб злавіць, ад КДБістаў уцёк. Зянона Пазняка мітынгоўцы адбілі ў спецслужбаў, і ён пазней выступіў і ў Курапатах. Алеся Бяляцкага (аднаго з арганізатараў таго мітынгу), пырснуўшы ў вочы «Чаромхай», запіхнулі ў міліцэйскі «варанок», а майго аднакурсніка па філфаку Дзмітрыя Арлоўскага літаральна цягнулі за доўгія валасы ў міліцэйскі ўазік. Усё гэта адбывалася з намі тады ўпершыню. Мо таму так добра помніцца і па сённяшні дзень.

Кастрычнік 2015 года

«У Беларусі Лукашэнка спыніў час. Яго ўменне прадаваць сваю біяграфію то Еўропе, то Расіі і атрымліваць за гэта газ і нафту... Гэтыя грошы сыходзяць на тое, што мы іх проста праядаем, а не ўкладваем у будучыню, у тэхналогіі. Але ён спыніў і сацыялізм. Заводы і фабрыкі належаць дзяржаве. Па вялікім рахунку, нічога не прададзена, нават маленькія прадпрыемствы. Ён захаваў псіхалогію сацыялізму, бо ён сам гэтай псіхалогіі чалавек. Ён увесь час гаворыць на гэтых прадпрымальнікаў, лічачы, што яны бандыты, што гэта несумленныя людзі. І адбылося такое спыненне. І ў беларусаў мякчэйшы варыянт гэтага сацыялізму», — сказала пра сённяшніх нас, а не толькі пра Аляксандра Лукашэнку, уганараваная ўпершыню сярод беларусаў Нобелем пісьменніца Святлана Алексіевіч падчас свайго выступу ў Кракаве.

Чырвоны чалавек (паводле Алексіевіч) неўзабаве ўручыў у «Мінск-Арэне» галоўны беларускі ордэн Францыска Скарыны другараднаму маскоўскаму кампазітару з беларускім прозвішчам Дробыш ды вінавацію Нобелеўскую лаўрэатку ў выліванні «цэбару бруду на сваю краіну»... Шмат было каментарыяў на гэты конт. А мне зноў узгадалася ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года. Бо вынік той крывавай ночы сёння і ў тым, што ў кастрычніку 2015 года Нобелеўскім лаўрэатам у галіне літаратуры становіцца беларуская пісьменніца, якая не піша па-беларуску, а прэзідэнтам Беларусі — усё той самы чырвоны чалавек.

Мікола КАНАНОВІЧ

НАБОЛЕВШЕЕ

«МНЕ ПОВЕЗЛО С РОДИТЕЛЯМИ МОИХ УЧЕНИКОВ»

ОТВЕТ АЛЕКСАНДРУ, УЧАСТВОВАШЕМУ В ОПРОСЕ «ЕСТЬ ЛИ КОРРУПЦИЯ В СЛОНИМЕ?»

В прошлом номере «ГС» проводила опрос на тему «Есть ли коррупция в Слониме?». После выхода газеты мы получили письмо — отзыв на ответ по этой теме слонимчанина Александра. «Да возьмите вы любую школу или детсад — там всё добровольно-принудительно. Недавно учительница говорит нам с женою, что сдаются взносы на нужды класса по 20 тысяч. А тут нам говорят: «Соберите каждый за неделю по 60 тысяч». Куда и зачем эти деньги — непонятно...» — сказал тогда Александр.

Работаю учителем в школе более десяти лет, но никогда не подумала бы, что в школе есть коррупция.

Я не знаю, в какой школе учится ваш ребёнок, Александр, но я никогда не занималась финансовыми вопросами. У нас в классе есть родительский комитет. Все финансовые вопросы решает он. Какую сумму сдают родители, я не знаю, как и не знаю то, собирают эти деньги одноразово, ежемесячно или еженедельно. Знаю только лишь то, что родительский комитет один раз в четверть делает отчёт по расходу родительских денег, при этом учитель, в данном случае я, не владеет этой информацией.

Я никогда не говорила родителям, что на нужды класса надо сдать такую-то сумму, на нужды школы такую-то и т.д. Я только собирала деньги на дополнительные рабочие тетради и тетради для факультативных занятий, потому что эти деньги потом отдавала заместителю директора по учебной работе, которая непосредственно рассчитывалась с представителями издательств, которые привозили заказанную литературу в школу. И то этими вопросами должен заниматься родительский комитет.

Для детей (но только на добровольной основе!) в школе организуется просмотр мультфильмов, иногда организуется поход в театр, а это всё стоит денег. А Вы, Александр, как я поняла, не знаете, куда уходят Ваши собственные деньги. Зачем же что-то говорить, если для начала можно было узнать, для чего учитель собирает эти деньги. Может, это как раз и были деньги для театра или цирка.

И ещё... Устроился человек на стройку работать, ему выдали строительный инструмент, сварщиком работаешь — пожалуйста, аппарат для сварки, защитная маска и т.д. А учитель? Он не человек? У него что, какая-то особая профессия? Ежемесячно учитель получает деньги на методическую литературу (с марта 2015 года — 43 800 рублей). За эти деньги учитель может купить стержни синий и красный, тетрадь для написания планов-конспектов, цветной мел, а вот денег на блок писчей бумаги не хватит (её начальная стоимость от 45 000 рублей). А заправка картриджа? Где вы видели секретаря, заправляющего картридж за свои собственные деньги? А учитель заправляет. Хорошо, если это чёрно-белая распечатка. Но на уроках, особенно в начальной школе, не обойтись без рисунков, картинок и т.д. А это уже совсем другая цена. А книга? Редко можно найти пособие менее чем за 40 000 рублей. А комплект плакатов по изучаемым темам стоит свыше 200 000 по каждому предмету.

Вы скажете, можно обойтись и без этого. Да, можно, но только чем больше видов памяти задействовано при запоминании, тем выше вероятность лучшего усвоения. Тем более, как правило, данные схемы или таблицы вывешиваются на видном месте и находятся там не один день, служат детям ориентиром-подсказкой.

А приобретение магнитов для магнитной доски, оформление классного уголка?.. Вот и получается, что учитель должен тратить собственные деньги на Ваших, Александр, детей. И тратит, печатает, покупает...

По санитарным нормам в классе должен быть организован питьевой уголок. Я думаю, что Вы знаете, сколько стоит бутылка бутилированной воды, добавьте к этому одноразовые пластиковые стаканчики.

Мне повезло с родителями моих учеников. Они всегда поинтересуются тем, что надо для класса. Очень благодарна им за стенды «Цифры» и «Звуко-буквенная таблица», бумагу для принтера, организованный питьевой уголок и многое другое.

Знаете, Александр, ни один уважающий себя учитель не будет требовать подарков. Поверьте, мы тоже получаем зарплату, пусть даже 3 500 000, и можем сами сделать себе подарок, или нам его сделают близкие и родные люди. Но любому учителю приятно на День учителя получить цветы, а больше нам не надо.

Ваша постоянная читательница А.К.



Мікола КАНАНОВІЧ
Email: mikolakan@gmail.com
Тел. 8-029-584-87-32

Слонімская кнігарня

«СЛОНИМСКАЯ ТЕТРАДЬ»


ДАДАЛАСЯ ДА «СЛОНІМСКАГА СШЫТКА» ІГАРА БУРСЕВІЧА

Нядаўна ў выдавецтве «Кнігазбор» у Мінску выйшаў другі том выбраных паэтычных твораў ураджэнца вёскі Чамяры Ігара Бурсевіча «Слонимская тетрадь». Раней у тым жа выдавецтве пабачыў свет яго зборнік выбраных вершаў і перакладаў на беларускую мову «Слонімскі сшытак».

Такім чынам Ігар Бурсевіч падвёў плён сваёй паэтычнай працы, якая раней увасобілася ў сямі зборніках паэзіі і перакладаў. Дзве апошнія кніжкі выйшлі пад цвёрдай вокладкай і выдатнай паліграфічнай якасці. І калі ў «Слонімскім сшытку» аўтар сабраў свае беларускамоўныя вершы і пераклады з рускай і польскай класікі, то ў другім томе змешчаны выключна творы на рускай мове.

«Слонимская тетрадь» — гэта своеасаблівы паэтычны і жыццёвы дзённік аўтара. Гэтаму падпарадкавана і кампазіцыйная будова кнігі, першы раздзел якой называецца «Школьныя перапынкі», затым ідуць «Зорны перазвон», «Рамантыка дарог» і апошняя частка «Радок за радком...». Раздзелы кнігі тут паўтараюць назвы ранейшых паэтычных выданняў Ігара Бурсевіча, а шматкроп`е ў назве яе апошняга раздзела як бы абяцае чытачу працяг сумоўя з аўтарам у будучыні.

Паэзія Ігара Бурсевіча ўвабрала ў сябе прыгажосць роднага краю і любоў аўтара да сваёй маленькай радзімы. Таму ў яго вершах шмат прысвячэнняў слонімскім мясцінам і людзям нашай зямлі. Ужо ў першым раздзеле «Слонимской тетради» чытаем вершы «Л.С. Мальцаву», «А.І. Чыгрыну», «Школа №6 г. Слоніма», «Наш 10 «В» клас. Выпускнікам 1966 года», «Слонімшчына». І хоць тут і ў наступных раздзелах кнігі часта гучаць і іншыя тэмы, аднак тэма Радзімы вялікай і радзімы маленькай як пачатак усяго існага і вартаснага ў жыцці чалавека і самога паэта праходзіць як асноўная праз усю творчасць Ігара Бурсевіча.



Першы том выбранага Ігара Бурсевіча



Другі том выбраных твораў Ігара Бурсевіча

Зноў і зноў паэт вяртаецца ў сваіх творах на маленькую радзіму, у Чамяры, якія пакінуў пасля школы, калі з беларускай глыбінкі з`ехаў вучыцца ў ваеннае вучылішча ў далёкі Камянец-Падольскі. Потым з бяскрайніх прастораў савецкай імперыі ваенны інжынер-мостабудаўнік Ігар Бурсевіч спяшаўся на радзіму пры кожнай магчымасці. І хоць большая частка жыцця прайшла за межамі Беларусі, сённяшні ваенны пенсіянер Расійскай Федэрацыі з падмаскоўнай Балашыхі, але разам з тым беларускі паэт Ігар Бурсевіч свае выбраныя творы аб`яднаў у двухтомніку «Слонімскі сшытак» вельмі арганічна і па-мастацку перакануўча.

ЖЫВАЯ ВАДА

ДА 120-ГОДДЗЯ СЛОНІМСКАГА ВОДАПРАВОДА ВЫДАДЗЕНА КНІГА «ТРАДЫЦЫІ ЖЫВОЙ ВАДЫ»



Вокладка кнігі «Традыцыі жывой вады»

Галоўным вынікам святкавання 120-годдзя водапровода ў Слоніме можна смела назваць выданне сёлета гэтай кніжкі ў сталічным выдавецтве «Канфіда».

Варта зазначыць, што ААТ «Слонімскі водаканал» не паскупіўся на паслугі паліграфістаў, і гісторыя мясцовага водаправода атрымалася каляровай і выдатна праілюстраванай на альбомнай паперы часопіснага фармату. Наклад у 400 асобнікаў таксама можна лічыць не малым па сённяшнім часе.

Выданне скіравана прэзентаваць слонімцам і гасцям горада гісторыю пабудовы тут і развіцця сеткі водаправода, але найперш — працу сучаснага Слонімскага водаканала. Тут паказаны наглядна і ў асобах найперш працоўныя будні водаканала, але ўзгадваецца такім чынам таксама спартыўнае і культурніцкае жыццё работнікаў прадпрыемства.

Кніга выйшла на рускай мове. І тым больш прыемна, што ў яе пачатку на фотаздымку панарамы Слоніма з вышыні птушынага палёту змешчаны трохстрофны верш Анатоля Іверса па-беларуску. Працытуем тут апошнюю страфу з гэтага верша:

Хай перажытае гора
Памяць мая беражэ.
Слонім, мой родны горад,
Ты мне за ўсё прыгажэй!

Безумоўна, і мясцовыя водаправодчыкі робяць родны горад усё больш прыгажэйшым (узяць хаця б фантаны на новай плошчы) і камфортным для жыцця слонімцаў. А як яны гэта робяць — цяпер часткова можна даведацца з кнігі «Традыцыі жывой вады», якую выдала і бясплатна распаўсюджвае ААТ «Слонімскі водаканал».

С НАТУРЫ

ПРИЕЗД НАЧАЛЬСТВА

Недавно на одном слонимском предприятии должен был появиться министр или даже премьер-министр. Ждали, конечно. Готовились. Важность его появления для предприятия была очевидной. Могли последовать новые инвестиции, а значит, и модернизация, которая любому предприятию, как правило, идет на пользу.

В тот день, подходя к предприятию, я заметил, что происходит явно что-то не то. Во-первых, наличие нескольких очень новеньких милицейских легковых машин. Во-вторых, практически отсутствие на стоянке машин сотрудников посреди буднего дня. В-третьих, перед самим предприятием в живописном беспорядке разместились четыре престижных черных легковых авто класса люкс.

А впереди, возле глухого забора, за которым заканчивались производственные корпуса, я увидел группу людей, человек двенадцать-пятнадцать. Чего-то обсуждали, руками размахивали. Подумал, сейчас подойду и послушаю. Связаны их взмахи руками с приездом министра или нет? Ведь министр всё же для людей, а не люди для министра.

Подхожу. Увы, это была молодежь. В спортивных куртках и кроссовках. Увидев меня, кончили обсуждение, пошли навстречу.

За ними стоял чуть растерянный дворник в униформе. В одной руке ведерко для мусора, в другой — специальная лопатка для сбора всяких бумажек, окурков и пустых пачек от сигарет. Когда я спросил его, кто к нам приехал, он помолчал и сказал:

— Министр какой-то. А кто, не знаю. — И стал озираться, оглядывая ближайшую территорию, нет ли где мусора, чтобы собрать его.

Владимир ШУМЕЛЬ

ЮБИЛЕЙ


Поздравления от учеников

ЗА 25 ЛЕТ ШКОЛУ №8 ОКОНЧИЛИ БОЛЕЕ ТРЁХ ТЫСЯЧ УЧЕНИКОВ

У школы №8 юбилей. Ей исполнилось 25 лет. Своих первых учеников она приняла в 1990 году.

По этому поводу в Слонимском центре культуры и отдыха состоялся праздничный концерт.

Юбилей школы отпраздновали с должным размахом. На торжественный концерт пришли учителя и работники школы, ученики и выпускники разных лет. Присоединились к празднованию и представители власти.

В фойе на стендах были вывешены фотографии выпускных классов за все годы.

За четверть века школу окончили 3 179 выпускников, из них с золотой медалью — 68 человек, серебряной — 79. Школа подготовила 16 призёров республиканских и 107 призёров областных предметных олимпиад. Четыре выпускника школы защитили кандидатские диссертации: Андрей Петлицкий, Анастасия Деницик, Станислав Суздаль, Евгений Третьяк.


Первый выпуск

В копилке школы 89 призовых областных мест, 45 — республиканских и 2 победы на международных фестивалях.

Первым слова благодарности и поздравления произнёс директор школы Иван Михальченя. Стоит отметить, что у директора также в этот день был юбилей.

Иван Чеславович рассказал о всех достижениях школы за этот период, назвал лучших педагогов и учеников, отметил ветеранов педагогического труда.

Выступила также первый директор школы Елена Хихол. Она вспомнила, как всё начиналось.

Пришли поздравить школу-юбиляра и спонсоры. На этом приятные сюрпризы не закончились. Школа стала обладательницей нового компьютера, холодильника, ЖК-телевизоров, профессиональных микрофонов и других презентов от гостей.

На сцену с музыкальными подарками выходили выпускники школы Александр Саванец, группа «Новый стиль» и другие.

Как отметили ведущие торжества, у школы славное прошлое и они надеются, что и будущее откроется для школы в своих ярких, светлых красках.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора


Учителя СШ №8. Фото на память


Маленькие звёздочки


Поют Иван Михальченя и Елена Фомченко


Поздравление от спонсоров

КВН

МОЛОДЁЖЬ В ШУТКАХ РАССКАЗАЛА, О ЧЁМ МЕЧТАЕТ


Сценка про армию СШ №9


Команда СШ №5


Сценка «Из школьной жизни». Команда СШ №10

В Слонимском центре культуры и отдыха 30 октября царили юмор, смех и артистизм. Школьники девяти команд из разных учреждений общего среднего образования нашего города играли в КВН.

«О чём мечтает молодёжь» — так звучала общая тема районного фестиваля КВН. Ребятам нужно было раскрыть её в течение 10 минут в рамках конкурса «Фристайл».

Выступление юных кавээнщиков оценивало строгое жюри.

Школьники шутили обо всём: слонимском футбольном клубе, ледовом дворце, экзаменах, любимчиках учителей, школьной столовой, военкомате, эвакуаторе и многом другом.

В итоге каждая команда получила грамоту в различных номинациях и подарок за своё выступление.

Победителем фестиваля стала команда «Поиск» из СШ №10.


Болельщики

В тему

Слонимская команда игроков в КВН «Слонимский бомонд» в конце ноября будет представлять Гродненскую область на Республиканской творческой акции (игра КВН) «Осенний марафон».

Стоит отметить, что в октябре в Гродненском государственном областном дворце творчества детей и молодежи состоялась творческая акция (игра КВН) «Осенний марафон» среди восьми команд Гродненской области. В результате упорной борьбы победила слонимская команда.



Выступление команды лицея

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора

Фоторепортаж и видео смотрите на сайте GS.BY

ТУСОВКА

ОКОЛО ТЫСЯЧИ СЛОНИМЧАН ПОСЕТИЛИ «МАМСЛЁТ»

Впервые в Слониме 31 октября прошёл необычный праздник под названием «Мамслёт».

По словам организаторов праздника, мероприятие собрало около тысячи слонимчан.

На грандиозной baby-тусовке присутствовали мамы, папы, дети и даже бабушки и дедушки.

На площадке гостей развлекали аниматоры, работали игровые зоны для малышей, игротеки с квалифицированными педагогами.

Все присутствующие могли посмотреть шоу мыльных пузырей, танцевальные и музыкальные номера, поучаствовать в озорных танцах, необычных играх и конкурсах.

Работал кэнди-бар для малышей с натуральными сладостями от профессиональных кондитеров.

Все желающие могли сделать фото на память в фотозонах с эксклюзивными декорациями и многое другое.

Татьяна ПЛАХЕТКО
Фото автора


Поёт Мая Караева


На игровых зонах




Ребята были в восторге от шоу мыльных пузырей


С ветерком


Фото на память


Каждый находил для себя развлечения

СПОРТ

ДВОЙНОЙ УСПЕХ БАСКЕТБОЛИСТА ИЗ НОВОДЕВЯТКОВИЧЕЙ

Октябрь стал успешным для представителя Слонимского района в составе сильнейшего баскетбольного клуба страны «Цмокі».

Международный турнир в Гомеле собрал пять команд из Беларуси и России. «Цмоки-99» заняли в турнире 1-е место, а слонимский баскетболист Владислав Близнюк, набиравший в среднем за матч по 18 очков, получил приз MVP турнира как лучший игрок.

С 22 по 25 октября в польском Кракове состоялся 1-й тур Евролиги по баскетболу, в котором участвовали 16 команд из Германии, Чехии, Дании, Польши, Литвы, Латвии, России.

Одержав три уверенные победы на старте турнира в противостоянии с латвийской «Валмиерой» 67-45, немецким «Мюнхеном» 73-55, литовским «СКМ» 65-49, в четвертом, как оказалось, решающем матче белорусская команда встретилась с еще одной литовской командой. Лишь грубые судейские ошибки в матче с будущим победителем турнира — баскетбольным клубом Марчюлёниса (на последних секундах игрок, который имел уже 5 фолов и не мог находиться на площадке, умышленно сыграл ногой и прервал атаку «Цмокаў», что позволило сопернику забить победный мяч и выиграть со счетом 54-53) не позволили стать первыми.

В последней игре тура в упорной борьбе с чешским «УСК» «Цмокі» также уступили — 38-46. Итог турнира — три победы в пяти матчах и турнирная «закрутка», в которой по разнице забитых и пропущенных мячей второе итоговое место досталось нашим соотечественникам.

Представитель Новодевятковичской СШ Владислав Близнюк, став в своей команде лучшим снайпером и лучшим по результативным передачам, вошел в символическую пятерку сильнейших игроков турнира и получил личный приз.

Следующие два тура Евролиги состоятся в январе в латвийской Лиепае. В марте в Минске и определят участников финала четырех, где будут разыграны итоговые призовые места.

Следить за турниром можно на сайте ЕЮБЛ (европейская юношеская баскетбольная лига, U-17 (1999)).

Дмитрий БЛИЗНЮК



Баскетбольная сборная страны «Цмокі»

СПАРТАКИАДА ШКОЛЬНИКОВ ПО ФУТБОЛУ СРЕДИ ДЮСШ И СДЮШОР

ВОШЛИ В ИСТОРИЮ СЛОНИМСКОГО ФУТБОЛА

В столице нашей страны с 27 по 31 октября на стадионах Ассоциации Белорусской федерации футбола прошла спартакиада школьников по футболу среди ребят 2001 года рождения.


Слонимская ДЮСШ №1 — участник спартакиады школьников по футболу в 2015 году

Среди восьми команд-счастливчиков оказалась команда ДЮСШ №1 Слонима. Всего старт в отборочных соревнованиях приняли 118 команд. Подопечные Руслана Корнева в областном первенстве были сильнее своих сверстников. Далее их ожидали республиканские испытания. На подобном форуме Слонимская ДЮСШ №1 оказалась впервые. До этого только отдельные юноши выступали в составах сборных области.

Ребята пребывали в ожидании старта, и вот соревнования начались. В первом же матче слонимчане вели борьбу с борисовскими сверстниками, которые представляют именитый БАТЭ. Встреча началась с атак наших футболистов, но справиться с волнением пришлось чуть позже, и в это время было упущено несколько перспективных моментов. Соперники, придя в себя, провели многоходовку, которая заставила слонимчан начать игру с центра поля — 0:1.

Игроки ДЮСШ №1 не смирились с происходящим и вновь бросились в атаку, но подвела простая ошибка в завершении. Искушённый соперник пошел в атаку — 0:2.

Вскоре и нашим юношам улыбнулась удача. Голевым ударом отметился Александр Лавор. С приходом второго тайма наши юноши заиграли первым номером. Стала прослеживаться более осмысленная игра. Заработали фланги, хорошо стали подносить снаряды полузащитники. Опасность возле ворот соперника назревала. И голы не заставили себя ждать. Свои выходы на ударные позиции реализовали нападающие — Александр Лавор сравнял счёт, а за пятнадцать минут до завершения встречи Александр Панов установил окончательный счёт — 3:2 в пользу Слонимской ДЮСШ №1. Так родилась первая сенсация первенства.

На следующий день слонимчане не сумели оказать достойного сопротивления столичному СДЮШОР ФК «Минск» и уступили со счётом 0:9.

В первые 18 минут слонимчане не только оборонялись, но и умело разыгрывали выходы на ударные позиции. А после того как соперник открыл счёт, почему-то сникли. Параллельно завершился поединок юношеских команд БАТЭ и «Белшины» — 5:2.

Третий игровой день дал ответ на вопрос, сможет ли наша команда бороться за бронзовые награды первенства. Увы, не сумели. На третьей минуте игры Александр Панов вывел слонимчан вперёд в игре с бобруйскими сверстниками из ДЮСШ «Белшина». Быстрый гол сыграл злую шутку. До перерыва соперники сумели дважды огорчить нашего голкипера и капитана команды Егора Юргеля.

Второй тайм прошёл более выразительно в исполнении новичков первенства. Два выхода тет-а-тет, перекладина, стойка ворот (и это ещё не все моменты, которые были созданы у ворот соперников) — но футбольная фортуна отвернулась от слонимчан.

Коллегия во главе с главным судьёй соревнований Юрием Мартыновым подвела итоги предварительных стартов, игр в группах. По истечении встреч команда ДЮСШ №1 финишировала на третьем месте в группе. Это означало, что команда поборется за итоговые 5-6-е места.

Последний матч республиканского первенства команда ДЮСШ №1 проводила против брестского Центра олимпийского резерва по футболу. Игра прошла в равной и напряжённой борьбе. Свои голевые моменты лучше сумели реализовать соперники. Они забили по мячу в каждом из таймов и победили 2:0.

Как и ожидалось, чемпионами стала команда СДЮШОР ФК «Минск», второе место досталось гомельчанам, на третьей ступени пьедестала — борисовчане. Юноши из Слонима получили неоценимый опыт подобных соревнований.

Егор ЖИГАЛИК
Фото автора


Взлетел!


Один на один



В атаке

ЮНОШЕСКОЕ ПЕРВЕНСТВО БЕЛАРУСИ ПО ФУТБОЛУ

ПОБЕДА И НИЧЬЯ СО СВЕРСТНИКАМИ ИЗ БЕРЁЗЫ

Приближается к окончанию первый круг юношеского первенства страны по футболу среди команд первой лиги.

На стадионе «Газпром трансгаз Беларусь» состоялись поединки ФК «Слоним» — ФК «Берёза». Первыми вступили в борьбу младшие юноши 2000 года рождения. Игровое и территориальное преимущество на протяжении всей встречи было за хозяевами поля. В первом тайме слонимчане трижды отметились голевыми ударами. Счёт открыл дальним ударом капитан команды Артём Макаревич — мяч влетел в верхний угол ворот.

Второе взятие ворот судья матча Вадим Ракса зафиксировал после того, как Александр Малиновский вовремя откликнулся на передачу с фланга. Тот же Малиновский наносил сильный удар в створ ворот в следующей атаке, но путь мячу преградил вратарь. Первым на добивание мяча успел Олег Циунчик — 3:0.

После перерыва преимущество хозяев не изменилось, но и счёт остался прежним. Все предпосылки для этого были, но голевые моменты Павла Полуносика, Александра Галая и Вадима Башко остались только в воспоминаниях.

Затем футбольный день на стадионе продолжился встречей ребят 1998 года рождения. Самые перспективные атаки, где, казалось, гол не минуем, не сумели реализовать Сергей Мандрык и Артур Борисевич.

В концовке встречи было два спорных момента. Так, вторую жёлтую карточку в матче получил и был удалён с поля Сергей Мандрык. Во втором эпизоде хозяева оспаривали, по их мнению, очевидный пенальти. Падение в штрафной площади Максима Мочалова арбитр оценил как случайное.

Ничья стала бесспорным результатом встречи.

Егор ЖИГАЛИК

АФИША СПОРТИВНОЙ НЕДЕЛИ

8 ноября


Футбол. Чемпионат Беларуси. Первая лига. 29-й тур. ФК «Слоним» — «Химик» (Светлогорск). Стадион «Юность». Начало в 14:00 часов.

4-6 ноября

Бокс. Открытое первенство Гродненской области среди юношей 2001-2004 годов рождения. Спорткомплекс. Начало 4 ноября в 15:00.

Наш сайт:
WWW.GS.BY

Дзятлава —



Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ
Уласны карэспандэнт
«ГС» на Дзятлаўшчыне
Адрас: 231471,
г. Дзятлава, а/я 31
Email:
375299518893@yandex.by

НАВІНЫ

СУСТРЭЧА З ПАЭТКАЙ

У Дзятлаўскім раённым таварыстве інвалідаў па зроку адбылася сустрэча з паэткай, жыхаркай пасёлка Гезгалы Верай Хрышчановіч.

Вера Ігнатаўна прачытала прысутным свае вершы, а потым павяла шчырую гаворку пра жыццё, пра веру ў Бога і веру ў свае сілы.

Інваліды падзякавалі госці за такую цёплую сустрэчу і выказалі пажаданне, каб яна прыязджала да іх часцей.

ДЛЯ КОГО КРЕСТ?

В Дятлове 13 ноября должны состояться областные «Дожинки».

Уже почти завершены все ремонтные работы по благоустройству этого небольшого города и района. Построили даже новую дорогу к сельскохозяйственному комплексу-передовику в деревне Поречье. В общем, все в лучших традициях СССР, ведь сельскохозяйственный комплекс приедет смотреть сам председатель облисполкома.

Недалеко от автодороги, ведущей из райцентра в то самое Поречье, находится маленькая вымирающая, как и большинство в районе, деревня Жиборты. И тут в её размеренной, текущей своим чередом жизни произошло событие — окраину деревни облагородили, снесли старые заброшенные постройки, расчистили территорию и поставили новый католический крест. Это все, конечно, очень хорошо, но есть одно "но". В этой деревне, где абсолютное большинство населения всегда составляли католики, место, где верующие могут прийти и помолиться, сделали только сейчас, когда в населенном пункте осталось чуть более десятка жителей и когда в 500 метрах от неё будет проезжать председатель. Наверное, он очень верующий…

Никита ПАСТУХОВ

СЯМ'Я

ТАЛЕНТ БЫЦЬ ШЧАСЛІВАЙ

Маладая жанчына памірала. Ужо і дактары сказалі ёй, што засталося зусім нядоўга. Яна, лічы, дзень і ноч ляжала з адкрытымі вачамі. Спачатку горка плакала, а потым, калі слёз не стала, пачала маліць Бога аб збавенні. Простымі, шчырымі словамі.

—Божа, — шаптала амаль нячутна, — дапамажы мне выздаравець. Ты ведаеш, у мяне двое маленькіх дзетак. А мама, як яна перажыве мой скон? А муж? У яго ж хворае сэрца.

Днём у палату, прыадчыніўшы дзверы, заглядвалі кабеты, якія таксама лячыліся ў бальніцы. Прыходзілі паглядзець, нібы на музейны экспанат. Ад гэтых цікаўных позіркаў было яшчэ цяжэй, і яна ўсё малілася:

—Божа, я зраблю ўсё дзеля шчырага служэння табе. Дапамажы...

І здарыўся цуд! Людміла Асіпук стала папраўляцца. Дзівіліся дактары, дзівіліся ўсе наўкола.

—Я праз нейкі час выпісалася з бальніцы зусім здаровая, але пра абяцанне, дадзенае Ўсявышняму ў цяжкія гадзіны, не забылася, — успамінае Людміла Мікалаеўна. — Толькі не ведала, што я павінна зрабіць. Аднойчы глядзела па тэлевізары перадачу аб дзецях-сіротах і падумала: вось чым буду займацца! Замяню маленькім маму.

Яна сказала пра гэта мужу, і Васіль Дзмітрыевіч не быў супраць. Неўзабаве ўзялі трох малых. Тады сям`я жыла ў пасёлку Казлоўшчына, муж працаваў інжынерам, а яна гадавала дзетак. Вялікага багацця не мелі, але былі шчаслівыя. Ад узаемаразумення, кахання.

На вялікі жаль, шчасце было нядоўгім: раптоўна памёр Васіль Дзмітрыевіч. Спынілася такое добрае, такое спагадлівае сэрца...

Гора яе было бязмежным, але ні на хвіліну не забывалася пра абяцанне, дадзенае Богу — гадаваць сіротак, быць ім апорай ва ўсім.

Дзіме, Пашу, Алёне, Kaці, Майклу, Ваню, Сашу і яшчэ шмат каму. Бачачы высакародныя памкненні Людмілы Мікалаеўны, цэнтр усынаўлення купіў вялікай сям`і дом у Дзятлаве на вуліцы Гагарына — прасторны, двухпавярховы. Якую ўтульнасць стварылі яны з дзеткамі, якую ўзорную чысціню навялі! А яшчэ ім дапамагала мама Людмілы Мікалаеўны, а для ўсіх маленькіх насельнікаў гэтага цудоўнага дома — клапатлівая бабуля. Яна ўмела ўсё: і зварыць, і спячы, і пашыць. А яшчэ яна ўмела прытуліць да грудзей, пагладзіць па маленькіх галоўках, суцешыць у розных дзіцячых няўдачах, якія ў такім узросце здаюцца вялікай трагедыяй.



Дачка Ева і ўнучка Жэня

Каля дзясятка гадоў таму назад я пісала пра іх, а цяпер пайшла даведацца, што змянілася, як яны жывуць цяпер. А змянілася вельмі многае, толькі ранейшай застаецца шчырая любоў Людмілы Мікалаеўны да сваіх дзетак. Гэта прыгожая жанчына з ласкавай усмешкай па-ранейшаму ўсё робіць дзеля таго, каб яе хлопчыкі і дзяўчынкі не адчувалі сябе адзінокімі, пакрыўджанымі лёсам, бо ў іх жа ёсць мама. Яна і парaіць, і дапаможа, і падтрымае ў цяжкую хвіліну. Яна — абаронца ад сцюдзёных жыццёвых віхур.

Я кажу, хлопчыкі і дзяўчынкі... Для яе так, яны па-ранейшаму дзеці, але цяпер у многіх ужо ёсць свае сем`і, свае дзеці. Напрыклад, Майкл пасля заканчэння Гродзенскага ўніверсітэта імя Янкі Купалы, дзе атрымаў прафесію праграміста, хутка ажаніўся. У іх з жонкай двое дзетак. Спачатку жылі ў Гродне, а цяпер купілі дом у Дзятлаве.

Паша — індывідуальны прадпрымальнік, а яго жонка Крысціна медсястра. Да слова, яны былыя аднакласнікі, каханне праверанае гадамі. У іх дзве дачушкі.

Дзіма працуе інструктарам па ваджэнні аўтамабіляў. Таксама жанаты. Мае дачушку.

Калі гаварыць карацей, то ў Людмілы Мікалаеўны ўжо трынаццаць унукаў, бо пераважная большасць яе дачок і сыноў, а ўсіх дваццаць тры, даўно дарослыя. Пяцёра яшчэ ходзяць у школу, а самая малодшая — Марынка — у дзіцячы садок.

Гэтая разумная мама заўсёды стараецца не толькі даць сваім дзеткам ежу і цяпло, але і імкнецца, каб яны гарманічна развіваліся. Сыны і дочкі Людмілы Асіпук вучыліся і вучацца ў школе мастацтваў, развіваюць творчасць у розных гуртках, наведваюць спартыўныя секцыі. Словам, заняты карыснымі справамі. Таму і людзі з іх вырастаюць дастойныя.

—Як вы з усім спраўляецеся? — пытаю. — **Гэта ж процьма работы!**

—Дык хіба я адна? У нас жа такая вялікая сям`я. Усе дзеці працуюць. Прычым не пад прымусам, а з вялікай ахвотай. Малодшыя вучацца ў старэйшых. Трымаем немалую гаспадарку: цацаркі, куры, трусы, свінні, два сабакі і два каты.

Шэсць гадоў назад Людміла Мікалаеўна зноў выйшла замуж. Яе муж з Афрыкі, з Беніна. На радзіме ён працаваў у дзіцячым доме псіхолагам.

—А як вы пазнаёміліся, жывучы на такой адлегласці? — здзіўляюся я.

—Сяброўка пазнаёміла. Яна жыве ў Германіі. Спачатку перапісваліся, а потым ён прыехаў і застаўся назаўсёды. Ужо мовай валодае на бытавым узроўні, добра мне ва ўсім дапамагае.

Два гады мінула, як у сям`ю прыйшло вялікае гора — памерла мама Людмілы Мікалаеўны, клапатлівая бабуля ўсёй вялікай сям`і. Яе дабрыня, спагада ўсё жыццё будуць саграваць сэрцы вялікіх і маленькіх унукаў.

...Прыйшлі са школы дзеці, прывялі з дзіцячага садка Марынку, і дом напоўніўся вясёлымі галасамі. А тут яшчэ дачка Каця завітала з сыночкамі Дэвідам і Кевінам. Я назірала, з якім замілаваннем глядзела Людміла Мікалаеўна на сваіх родных, якім шчасцем свяціліся яе вочы, і падумала, што ў гэтай цудоўнай жанчыны, акрамя ўсяго, ёсць вялікі талент быць шчаслівай. Не кожнаму такое дадзена, а яе Бог адарыў. Нездарма так шчыра і пранікнёна моліцца яму кожны дзень і дзякуе за ўсё, што выпала на долю.



Людміла Мікалаеўна на ганку свайго дома



Дачка Каця з сыночкамі Дэвідам і Кевінам

наш край

НА ЖЫЦЦЁВЫХ СКРЫЖАВАННЯХ

СВЯТЛО ДАЛЁКАЙ ЗОРКІ

Кожны год, як надыходзіць свята памінання памерлых Дзяды, а яно адзначаецца 2 лістапада, я еду больш як за чатырыста кіламетраў, каб пакланіцца магіле дарагога чалавека. Ён падарыў мне другое жыццё...

—Алёша, званіў дзядзька Васіль і казаў, каб ты ехаў у горад Мінайск. Ён там знайшоў для цябе работу! — радасна паведаміла мама, калі я вярнуўся з выпускнога балю. — Спаць во не клалася, усё цябе чакала. Каб сказаць.

Дзядзька Васіль — мамін стрыечны брат — жыў у Мінску і быў немалым начальнікам. Ён ведаў, што я мару стаць журналістам, што з пятага класа пішу заметкі ў нашу раённую газету, і вырашыў дапамагчы.

—А мяне возьмуць без адукацыі?

—Возьмуць, кажу ж, ён дамовіўся. А вучыцца можна і завочна.

У 60-х гадах мінулага стагоддзя такое было нярэдка: выпускнікоў сярэдняй школы бралі на работу з той умовай, што яны паступяць вучыцца на завочнае аддзяленне па сваёй спецыяльнасці. Ды так і паступіць было лягчэй.

Надоўга не адкладваючы, я паехаў у той далёкі гарадок на захадзе Беларусі. Невялікі, але чысценькі і прыгожы. Усюды на вуліцах цвілі кветкі. І ля будынка рэдакцыі раённай газеты, да якога мяне прывяла незнаёмая дзяўчына, хораша пахла маленькімі беленькімі кветкамі, якія называліся сняжок.

У кабінеце рэдактара за сталом сядзеў мажны чалавек. Русавалосы, у белай кашулі і чорным гальштуку. Твар яго быў суровы, позірк шэрых вачэй стомлены.

—Малады спецыяліст, — здагадаўся Станіслаў Адамавіч, адказаўшы на прывітанне. — Хаця які ты яшчэ спецыяліст, спецыяліста з цябе трэба зрабіць...

Ён прыняў мяне на работу літсупрацоўнікам у аддзел сельскай гаспадаркі пад апеку загадчыка — маладога жвавага Апанаса Сымонавіча.

Ці трэба казаць, які з мяне быў літсупрацоўнік, тым больш сельскагаспадарчага аддзела, калі я нарадзіўся і вырас у горадзе, а тут раптам сутыкнуўся з такімі цяжкасцямі. У рэдакцыі не было транспарту. Пад`едзеш на аўтобусе, а потым ідзі пешшу з дзясятак кіламетраў. Не меў ні жыццёвага, ні прафесійнага вопыту, але меў упартасць і жаданне пра ўсё даведацца, усяму навучыцца. Не раз даводзілася начаваць у далёкіх вёсках. Гэта збліжала з людзьмі, так я пазнаваў іхняе жыццё.

Нягледзячы на старанне, аднойчы бязбожна пераблытаў паказчыкі на жніве і імёны герояў свайго рэпартажу. Было прыкра, сорамна. Нас з рэдактарам паклікалі ў райкам партыі, бо за такія памылкі па галоўцы не гла-дзілі. Рэдактару далі вымову, а ён даў яе мне.

—Не буду я тут працаваць! — сказаў я з адчаем.

—Будзеш, — спакойна сказаў рэдактар. — Ад вымовы яшчэ ніхто не памёр. Другі раз глядзі больш уважліва.

Ішлі гады. Я паступіў на завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі БДУ і паспяхова яго скончыў. Шмат чытаў літаратуры па сельскай гаспадарцы, пасябраваў са спецыялістамі райсельгасупраўлення, і яны мяне многаму навучылі. Добрыя веды даў і Станіслаў Адамавіч. І калі Апанас Сымонавіч пераехаў на працу ў Мінск, я стаў загадчыкам сельгасаддзела.

У час вучобы ва ўніверсітэце пазнаёміўся з прыгожай дзяўчынай Жаннай. Яна заканчвала медыцынскі інстытут. Калі атрымала дыплом, мы пажаніліся.

Так бы мовіць, дзіця гарадской шпакоўні, што вырасла на асфальце, Жанна ніяк не магла прывыкнуць да спакойнага і аднастайнага жыцця ў маленькім гарадку. Акрамя кінатэатра, нам не было куды пайсці. Вечарамі сядзелі дома ля маленькага тэлевізара «Нёман», які нам падарылі яе бацькі. Жылі на прыватнай кватэры без зручнасцяў.

Праз паўтара года Жанна не вытрымала, звольнілася з работы ў паліклініцы і падала на развод.

—Я ў гэтай вялікай вёсцы загублю сваю маладосць! Каб не ведала іншага жыцця, то ладна. А так... Не магу больш, даруй...

З яе ад`ездам у мяне, так бы мовіць, зямля паплыла з-пад ног, бо я вельмі любіў Жанну. У выхадны дзень паехаў следам і ўгаворваў вярнуцца. Ды што тыя ўгаворы! І перад разводам іх было даволі...


МАЛЮНАК ЯЎГЕНА ІВАНОВА

Вярнуўшыся, купіў бутэльку гарэлкі і паспрабаваў заглушыць душэўны боль і адчай. Мне гэта тады здавалася паратункам. Пачаў піць кожны дзень. Пісаў абы-што і абыяк.

—Што ты сабе думаеш, Алёша! — Станіслаў Адамавіч глядзеў на мяне з болем і спагадай. — Не трэба сябе губіць. Ты талковы журналіст, прыстойны, годны чалавек і топіш сябе ў гарэлцы. Яна і розум адбярэ, і талент, і прыгажосць. Скажы, чым табе дапамагчы?

—Падпішыце заяву аб звальненні... Я не магу больш так. Ну, які цяпер з мяне журналіст? Не хачу ганьбіць і вас, і газету.

Назаўтра рэдактар падпісаў заяву, і я пайшоў блукаць па пакутах. Вучыўся класці цэглу на будоўлі, потым ужо ў другой будаўнічай арганізацыі вучыўся атынкоўваць сцены, быў грузчыкам у магазіне. Зноў на будоўлі. Усюды да першага запою. А ён цягнуўся тыдзень, і яшчэ тыдзень я ачуньваў. Хто бу-дзе трымаць такога работніка?

Памятаю, аднойчы зімой я зноў вярнуўся ў тую будаўнічую арганізацыю, з якой пачынаў. Прыходзіць майстар і кажа, каб я зайшоў у бытоўку, маўляў, там цябе чакаюць. Калі адчыніў дзверы, не паверыў сваім вачам: мяне чакалі мой рэдактар і фотакар Мікалай Рубяжэвіч. Я павітаўся і няўцямна пазіраў на іх.

—Мы неўзабаве будзем мяняць журналісцкія дакументы. Я хачу, каб памяняў і ты, — сказаў рэдактар. — Запоўні анкету, Мікалай цябе сфатаграфуе.

На той час я быў членам саюза журналістаў СССР. Цяжка сказаць, чаго ў маёй душы было больш: радасці, здзіўлення ці пякучага сораму. На мяне ўжо ўсе махнулі рукой: маўляў, не будзе ніякага толку з гэтага хлопца: апоек апойкам. Я ўжо і сам не верыў ні ў што добрае... А мой дарагі Станіслаў Адамавіч верыць. Верыць! Інакш не сядзеў бы цяпер у гэтай пракуранай бытоўцы, не глядзеў бы на мяне з такім шкадаваннем і разуменнем.

А вечарам... я зноў купіў бутэльку гарэлкі і напіўся. Ужо з радасці. Зноў пачаўся запой.

—Ну ты і... — майстар, які прыйшоў да мяне назаўтра пасля работы, відаць, хацеў назваць нейкім брыдкім словам, але не вымавіў яго. — Такі чалавек у цябе верыць, а ты! Праўда, што гарбатага магіла выправіць. Рукі табе больш не падам! І калі вылезеш з запою, то на работу больш не прыходзь. Скажу начальніку, каб выпер па артыкуле, а то ўсе шкадуюць, усе па ўласным жаданні звальняюць. Такога... — ён вылаяўся і пайшоў прэч.

Назаўтра я не могучы паплёўся не ў магазін па бутэльку, а ў паліклініку па накіраванне ў наркалагічнае аддзяленне псіхбальніцы, якое знаходзілася ў далёкім горадзе.

Не буду казаць, колькі перажыў там фізічных і душэўных мук. Калі галава ачысцілася ад алкагольнага туману, я нібы паглядзеў на сябе збоку. І стала страшна ад таго, што ўбачыў. Але і надзея з`явілася, што здолею сябе перамагчы, што ўсё добрае яшчэ можа вярнуцца.

Аказваецца, даведаўшыся, што я паехаў лячыцца, з работы не звольнілі, і таму пасля выпіскі вярнуўся на будаўнічы аб`ект. Кожную раніцу я прачынаўся шчаслівы ад таго, што цвярозы. Радавала ўсё: і вясна, што дружна абрынулася на наш гарадок, і цяжкая работа. Нават слова «алкаш», якое іншы раз кідалі ўслед злыя людзі, не крыўду выклікалі, а ўсмешку.

У пачатку восені мяне паклікаў да сябе Станіслаў Адамавіч.

—Ты вось што... У рэдакцыю трэба вяртацца. Месца якраз вызвалілася.

Бачачы, як я пачырванеў і сумеўся, сказаў:

—Ведаю, што не п`еш. Думаеш, не цікавіўся, не пытаў у людзей?

Шчаслівейшага за мяне чалавека не было на свеце! Я гатовы быў стаць перад Станіславам Адамавічам на калені.


Нядоўга нам давялося папрацаваць разам. Акурат перад Новым годам мой дарагі рэдактар раптоўна памёр ад сардэчнага прыступу. На яго пахаванні я плакаў як асірацелае дзіця... А яшчэ праз год мяне забралі на работу ў сваю вобласць.

...Як і заўсёды, я паклаў на магілу Станіслава Адамавіча кветкі, запаліў лампадку. Памаліўся і падзякаваў за тое, што вярнуў мяне да жыцця. Яго вобраз, як святло далёкай зоркі, будзе саграваць мяне да скону дзён.

З пашанай,

Аляксей Іванавіч

Масты —



Язэп ПАЛУБЯТКА
Уласны карэспандэнт
«ГС» у Мастах
Адрас: 231600,
праспект Юнацтва, 12/21
Email: jazep.2004@tyt.by
Тэл: +37529 126-46-92

СПОРТ

ВЕСЛЯРЫ ПАДВЯЛІ ВЫНІКІ СЕЗОНУ



Неаднаразовая чэмпіёнка РБ Вольга Калоша



Дзмітрый Лапата заваяваў бронзу

У сезоне-2015 юныя мастоўскія весляры паказалі добрыя вынікі. Хлопцы і дзяўчаты Гродзенскага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па веславанні, што ў Мастах, за сезон заваявалі 79 залатых медалёў, 70 срэбраных і 56 бронзавых.

Медалі былі здабыты як на абласных, так і на рэспубліканскіх спаборніцтвах: на абласных — 68 залатых, 47 срэбных, 29 бронзавых медалёў; на рэспубліканскіх — 11 залатых, 22 срэбраных і 27 бронзавых.

Паспяхова мастаўляне выступалі і на міжнародных спаборніцтвах. На чэмпіянаце Еўропы сярод моладзі Дзмітрый Лапата на дыстанцыі 500 метраў у складзе каноэ-чацвёркі заваяваў бронзу, а на каноэ-адзіночцы на 1 000 метраў быў сёмым.

Ёсць поспехі і ў дзяўчат. На чэмпіянаце Еўропы сярод юніёраў Кацярына Бандарэнка ў складзе байдаркі-чацвёркі паказала восьмы вынік.

ВЕСТКІ З МАСТОЎШЧЫНЫ

МАСТЫ РУХАЮЦЦА Ў ЕЎРОПУ

На Мастоўшчыне распачынаецца рэалізацыя другога праекта, які фінансуе Еўразвяз па Праграме развіцця ААН. У рамках праекта «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі» Мастоўская раённая арганізацыя грамадскага аб`яднання «Беларускае таварыства інвалідаў» здзейсніць праект пад назовам «Дыспетчарызацыя і аўтаматызацыя сельскіх водазабораў Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці з вывадам інфармацыі на цэнтральны дыспетчарскі пункт г. Масты».



Чыстая пітная вада — жыццёвая неабходнасць на Мастоўшчыне

Працей кажучы, праект звязаны з кіраваннем воднымі рэсурсамі раёна. Пакуль шырокай грамадскасці невядомыя як асаблівасці гэтага праекта, так і яго каштарыс. Аднак праблема якасці пітной вады на Мастоўшчыне актуальная. Калі з пабудовай станцыі абезжалезвання для горада яе часткова ўдалося вырашыць, то колькасць нітратаў у вадзе, якую спажываюць вяскоўцы, вялікая. Пятнаццаць гадоў таму ў вёсцы Масты Левыя ад такой вады надарылася смерць немаўляці.

Праект «Садзейнічанне...» з`яўляецца своечасовым дадаткам да беларускіх экалагічных праектаў, паколькі ён закранае вырашэнне такіх пытанняў, як змена клімату, абарона біяразнастайнасці і эфектыўнае выкарыстанне рэсурсаў, развіццё экалагічных вытворчасцей, змяншэнне колькасці шкодных выкідаў.

Варта яшчэ зазначыць, што прынцыпы «зялёнай» эканомікі адносна новыя для Беларусі. Кіраўнік рэспубліканскага праекта «Садзейнічанне...» — Вольга Чаброўская.

Мастаўляне ўжо маюць вопыт працы ЕЗ і ААН. Тут былі паспяхова рэалізаваны сумесны з гэтымі арганізацыямі праект «Садзейнічанне развіццю ўсеаб`ёмнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў вобласці аховы навакольнага асяроддзя ў РБ». У межах таго праекта, які завяршыўся ў 2014 годзе, быў наладжаны раздзельны збор і сарціроўка смецця. З`явіліся кантэйнеры для раздзельнага збору бытавых адыходаў, прэсы для паперы і пластыку, закуплены сучасныя смеццявозы (адзіныя ў РБ) і шмат іншай тэхнікі. Вынікі прымянення новых тэхналогій сталі адразу відавочныя. За 9 месяцаў мінула года на перапрацоўчыя прадпрыемствы было здадзена 450 тон другасных матэрыяльных рэсурсаў. Некалькі гадоў таму назад гэтая лічба складала прыкладна 240 тон. Акрамя таго, было закуплена і ўстаноўлена 900 біякампостараў. Па рэалізацыі праекта ў раёне колькасць мініпалігонаў для смецця зменшылася на 18.

Згодна са словамі кіраўніка мясцовай ЖКГ Сяргея Фралова, самым складаным напачатку ў гэтай справе было дамагчыся таго, каб жыхары правільна раскладвалі смецце па кантэйнерах. Да гэтай інфармацыйнай кампаніі далучыліся мясцовыя грамадскія актывісты руху «За свабоду», «Разам» і «Гарадзенская ініцыятыва». Тады супольнымі іх намаганнямі быў выдадзены беларускамоўны буклет па прынцыпах раздзельнага збору смецця.


ЭКАНОМІКА

КУДЫ ПАЙШЛІ АКТЫВЫ «МАСТОЎДРЭВА»

Згодна з прынятым рашэннем прэзідэнта Беларусі, Банк развіцця Рэспублікі Беларусь павінен прыняць ва ўпраўленне актывы ААТ «Мастоўдрэў».

Як паведамляе старшыня праўлення банка Сяргей Румас, гэтае рашэнне было прынята па выніках нарады, прысвечанай выкананню даручэння прэзідэнта ў галіне дрэваапрацоўкі.


Зроблена гэта пасля незалежнага аналізу бізнес-плана, які даў станоўчы вынік. Тое і стала падставай для перадачы актываў банку. Гэта ўсё азначае, што атрымана станоўчае заключэнне ў частцы магчымасці пагашэння крэдытаў ва ўстаноўленыя тэрміны. На думку спецыялістаў банка, праца прадпрыемства можа палепшыцца ўжо да канца першага паўгоддзя 2016 года.



Вытворчы працэс

Неабходна заўважыць, што ў 2007 годзе Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ наконт мадэрнізацыі дрэваапрацоўкі ў Беларусі. Дзевяць прадпрыемстваў гэтай галіны, у тым ліку «Мастоўдрэў», атрымалі ад дзяржавы прэферэнцыі па выплаце падаткаў і мытных пошлін. Была рэканструявана іх запазычанасць перад рэспубліканскім і мясцовым бюджэтамі, пасля чаго гэтыя заводы змаглі атрымаць крэдыты на мадэрнізацыю пад гарантыі ўраду.

Наколькі рэальныя прагнозы спецыялістаў банка адносна мастаўлян, пакажа час. А пасля здачы ў эксплуатацыю цэха па вытворчасці пліты МДФ на прадпрыемстве засталіся старыя праблемы і ўзніклі новыя: адсутнічаюць рынкі збыту і, адпаведна, няма прыбытку. Як следства, энергетыкі штомесяц у тым ці іншым цэху адключаюць электрычнасць за няплату і вытворчасць спыняецца. Рабочыя застаюцца без працы і заробку.



Пліта МДФ — новая прадукцыя прадпрыемства

наш край

НАРЫС

ГЕНІК ЛОЙКА І МІКЕЛЕЎШЧЫНА

Сёння пойдзе гутарка пра знакамітага беларуса з Мастоўшчыны, пра творчасць і грамадскую дзейнасць якога ў роднай вёсцы Мікелеўшчына ведаюць адзінкі.

Мікелеўшчына раней і сёння

Бадай, варта пачаць расповед пра нашага героя з гісторыі яго вёскі. Мікелеўшчына знаходзіцца на мяжы Шчучынскага і Мастоўскага раёнаў. Упершыню ўпамінаецца ў пісцовай кнізе Гродзенскай эканоміі ў 1558 годзе. Галоўнай яе адметнасцю з`яўляецца касцёл пад тытулам Наведзінаў Найсвяцейшай Панны Марыі, які быў узведзены на мясцовых могілках у 1823 годзе на сродкі Багумілы Бутаўт-Анджэйкавіч з роду Грамыка як філіяльны ад Мастоўскай парафіі. Касцёл кансэкравалі 8 верасня 1826 года. У 1878 годзе святыня была рэканструявана. Тады да галоўнага аб`ёму была дабудавана вежа і нартэкс. У 1911 годзе касцёл атрымаў статус цэнтра самастойнай парафіі.

Вёска да апошняга часу была ў адну вуліцу ды дзялілася на дзве часткі старадаўнім трактам Гародня — Масты — Ліда — Вільня. Магчыма, з тае нагоды мясцовыя жыхары далі ім назвы: Падсмалярня і Вашабіткі. Вось у апошняй частцы вёскі ў Станіслава і Ганны Лойка 9 сакавіка 1962 года нарадзіўся сын Генік. Усяго ў сям`і было пяцёра дзяцей, Генік быў сярэднім. У Мікелеўшчыне застаўся жыць самы меншы, Стась, які збудаваў хату ў другой палове вёскі. Будучы знакаміты скульптар пражыў тут толькі 11 гадоў, таму ён не змог удзельнічаць у разборках паміж хлопцамі абедзвюх палоў вёскі падчас танцаў тых часоў. Генік у школе добра маляваў, і таму маці, як даведалася пра чарговы набор вучняў у Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве, павезла сына туды.

Хлопцу пашанцавала. Яго прынялі на аддзяленне скульптуры. Тут ён навучаўся з 5-га па 11-ы клас.

Настаўнік

Шлях да беларускай мовы, а праз яе да беларускасці, на маю думку, быў у хлопца спрошчаны. Вёска, хоць і каталіцкая, але, як раней, так і цяпер беларускамоўная. І навучанне ў школе ў тыя часы таксама вялося на беларускай мове. А вось стаць на шлях нацыянальных поглядаў дапамог яму настаўнік гісторыі мастацтва Генадзь Сокалаў-Кубай. Ён пастаянна даводзіў сваім вучням, што існуе ў адрозненне ад афіцыйнай гісторыі іншая, сапраўдная, ды распавядаў яе вучням.

Аднойчы замест экскурсіі ў Ленінград ён павёз сваіх вучняў у Вільнюс і там загаварыў з імі на беларускай мове. Для многіх гэта было прыемным адкрыццём. Потым была паездка на спеўны фэст, дзе вучняў уразіла колькасць і адметнасць нацыянальных строяў. Неўзабаве настаўнік за сваю прыхільнасць да беларускасці быў звольнены з працы, але пасеянае дало плён.

Кола аднадумцаў

Да паступлення ў тэатральна-мастацкі інстытут хлопец рыхтуецца выключна на беларускай мове. Падчас вучобы ён аднаўляе кантакты з Вінцуком Вячоркам, з якім пазнаёміўся раней у Вільні. Пачало стварацца кола аднадумцаў.

На першым курсе іх групу паслалі ў калгас капаць бульбу. Пачуўшы размову студэнтаў па-беларуску, да іх падышоў Ігар Марачкін. Яны



Мастак Генік Лойка

шчыра ўзрадаваліся — свой.

Неўзабаве ўзнікла ідэя правесці агульную сустрэчу тых, хто размаўляе па-беларуску. Пагадзіліся, што трэба нешта рабіць: адраджаць беларускую мову і культуру. Ужо позняй восенню 1980 года заявіла аб сабе «Майстроўня». І тады хлопцы і дзяўчаты ўпершыню праспявалі Уладзіміру Караткевічу калядныя песні. Генік і зараз успамінае, як тады разгубілася міліцыя, не ведала, што рабіць, як сябе з імі паводзіць.

Дзейнасць «Майстроўні» не абмяжоўвалася аднымі спевамі. 13 чэрвеня 1984 года адбыўся пікет супраць зносу будынка першага беларускага тэатра. І тут улады ўзяліся за «Майстроўню» і яе ўдзельнікаў. Ужо восенню таго года «Майстроўня» спыніла сваё існаванне. Запалохванне Лойкі, што ён будзе праходзіць вайсковую службу ў «краі белых мядзведзяў», не спраўдзілася. Напачатку ён праходзіў службу ў Мінску, а



Малады Генік Лойка

потым у Гродне.

Аднак справа, распачатая «Майстроўняй», не згасла. Паўстала «Талака». Таксама працягваліся спевы пад кіраўніцтвам Ларысы Сімковіч, і ўтварылася суполка «Дзянніца». Затым аднадумцы на глебе беларускага адраджэння ўтвараюць Таварыства беларускай школы, распачынаюць ладзіць у Траецкім прадмесці суботнікі. Падобныя арганізацыі сталі ўзнікаць і ў іншых рэгіёнах Беларусі. Неўзабаве ствараецца Канферэнцыя беларускіх суполак.

Жыццё і творчасць

Пасля службы ў войску Генік Лойка ўладкоўваецца на працу ў музей народнага дойлідства і побыту, што ў вёсцы Азярцо пад Мінскам. Неўзабаве мяняе месца працы на музей-запаведнік у Заслаўі. Пасля працуе ў акадэмічных творчых майстэрнях пад кіраўніцтвам Заіра Азгура і навучаецца ў аспірантуры.

Найбольш плённы перыяд у працы прыпадае на працу выкладчыкам у школе, дзе раней навучаўся сам. У 1999 годзе са сваімі вучнямі правёў цікавую практыку — рабілі скульптуры з пяску. Завёз іх у Заслаўе, і ў адным з кар`ераў навучэнцы выразалі скульптуры з пяску. Гэту цікавую ідэю ў вучэльні не падтрымалі. На наступны год ён зноў набірае групу вучняў, выключна з тых, хто размаўляе па-беларуску, і яны выязджаць на мясцовасць.

2000 год у гісторыі Беларусі быў асаблівы: тысячагоддзе са дня народзінаў Рагнеды. Перад навучэнцамі ставіцца канкрэтная задача — стварыць 40-метровую скульптуру беларускай славутасці. Азначылі арыенціры і пачалі капаць. Калі праз тры дні сталі вырысоўвацца контуры скульптуры, у дзяцей узнікла яшчэ большае жаданне працаваць.

Падобныя пленэры адбываліся на працягу 10 гадоў. Аднак канфлікт між Лойкам і кіраўніцтвам вучэльні рос, і ён адтуль сыходзіць, але без працы не застаецца. Мастака адразу запрашаюць працаваць у 185-ю сталічную школу з мастацкім ухілам. Яго белчырвона-белую стужку, заўжды павязаную на галаве, тут сцярпелі, але не сцярпелі ўдзел у выбарчай кампаніі 2006 года ў камандзе кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Мілінкевіча — зволілі з працы за два месяцы за заканчэння навучальнага года.

Затым Лойка яшчэ год прапрацаваў у мастацкай вучэльні імя Глебава. Год навучаў дзяцей без дысцыплінарных заўваг, але бел-чырвона-белая стужка кагосьці раздражняла, і адбылося чарговае звальненне.

Зараз Генік Лойка — вольны мастак. Апошнім часам ён вырабляе мемарыяльную дошку для дома ў Празе, дзе жыла Ларыса Геніюш.

Што да асабістага жыцця, то ў 1983 годзе Генік Лойка пабраўся шлюбам з Аленай Каравай, аднакласніцай па вучэльні. У іх трое дзяцей: Яраш, Кіра і Любарт. Дзеці — выдатнікі вучобы і дома размаўляць выключна па-беларуску.

На радзіме Геніка Лойкі яго маці Ганна Міхайлаўна жыве адна. Бацька Станіслаў Зыгмундавіч памёр. Двор ля хаты чыста прыбраны, дапамагае малодшы Стась. Як сведчаць аднавяскоўцы, Генік не часта бывае тут. І памятны ён ім доўгіміваласамі, якія павязаны белчырвона-белаю стужкаю. Яшчэ за ім цягнецца ўчэпістае «бэнэфавец». Іншага пра свайго земляка яны не ведаюць.

Вёска яшчэ не выміраючая, але сацыяльных праблемаў шмат. Некалькі гадоў таму не стала калгаса з прычыны ўзбуйнення. Зліквідаваны сельскі савет. У школе навучаецца менш за 50 вучняў, і іх колькасць з кожным годам змяншаецца. Адно радуе, што паўстала моцная фермерская гаспадарка «Мара», якую ўзначальвае Віктар Кандратовіч.

Фота з архіва аўтара



Мемарыяльная шыльда ў гонар Ларысы Геніюш для дома ў Празе, дзе жыла паэтка, работы Геніка Лойкі

З ПОЛЬСКАГА ДЗЁННІКА

ХОЧАШ НЕ ХОЧАШ — ВЫБІРАЙ,

ЦІ ЯК ПРАХОДЗЯЦЬ ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў ПОЛЬСКАЙ ПРАВІНЦЫІ

Працяг
Пачатак у №44

У Слупцы перад выбарамі кандыдаты дэбатавалі

У аўторак, 20 кастрычніка, у польскай Слупцы прайшлі дэбаты між кандыдатамі партый, якія прэтэндуюць на месцы ў сейме і сенаце краіны. Арганізавала тыя спрэчкі рэдакцыя «Кур`ера Слупецкага», не прамінуўшы, вядома, скарыстацца магчымасцю прарэкламаваць сваё выданне. «Прыйдзі, паслухай і задай пытанне. Выбірай свядома!» — заклікаў рэкламны плакат.

У час абеду ў мясцовай музычнай школе супрацоўнікі рэдакцыі рыхтавалі залу для дэбатаў — расстаўлялі крэслы і сталы, усталёўвалі неабходную апаратуру, каб транслявацъ дэбаты анлайн у інтэрнэце (іх можна паглядзець у сецівеі цяпер). Дарэчы, залу ў школе яе дырэктар прадаставіў рэдакцыі бясплатна.

Рэдактар газеты Януш Ансіён шкадаваў, што іх дэбаты супалі па часе правядзення з дэбатамі лідараў партый, якія ўдзельнічаюць у перадвыбарчай гонцы. Але такое супадзенне не перашкодзіла правесці спрэчкі на мясцовым узроўні — зала музычнай школы ў шэсць гадзін вечара была амаль цалкам запоўнена. Паслухаць мясцовых палітыкаў сабраліся ў пераважнай большасці мужчыны сярэдняга і сталага веку. Адным з першых прыехаў (без суправаджэння) чалавек на інвалíднай калясцы.

На дэбаты прыйшлі 7 з 10 кандыдатаў са Слупецкага павету — гэта настаўнік матэматыкі і дырэктар мясцовай школы, настаўнік гісторыі, марак, сельскі віцэ-мэр, 24-гадовы фінансіст, які працуе ў прыватнай фірме і які быў прадстаўлены як слупецкая знакамітасць, вядомы доктар мясцовага шпіталя і электраэнергетык з дзвюма вышэйшымі адукацыямі. Апошні, дарэчы, адзіны, хто жыве не ў Слупцы, а ў суседнім горадзе. Не з`явілася на дэбаты тры кандыдаты, у тым ліку цяперашні віцэ-спікер польскага сейма, які балатуецца ў парламент у другі раз, і адзіная жанчына-кандыдат.



Кандыдаты падчас дэбатаў



Дэбаты трансляваліся анлайн у інтэрнэце

Праблемы бежанцаў, пенсій і падаткаў

Першы раўнд дэбатаў быў прысвечаны абмеркаванню трох пытанняў, якія хвалююць сёння ці кожнага жыхара Польшчы, — гэта бежанцы, пенсійны ўзрост і падаткі. Погляд на вырашэнне гэтых праблемаў выказаў кожны з сямі прысутных кандыдатаў.

—Несур`ёзна казаць, што некалькі тысяч мусульман могуць нейкім чынам паўплываць на каталіцкую краіну, — зазначаў падчас свайго выступлення першы выступоўца. На гэта адзін з бакоў заявіў, што паводле рашэння Еўрасаюза Польшча павінна прыняць 100 тысяч бежанцаў, аднак кіраўніцтва краіны вырашыла не абнародаваць гэты факт да выбараў.

—Трэба найперш прыняць палякаў, якія жывуць па-за Польшчай, напрыклад у Казахстане і іншых краінах, і вырашаць найперш свае ўласныя праблемы ўнутры краіны, — не пагаджаліся іншыя.

Меркаванні наконт узросту выхаду на пенсію таксама раздзялілі кандыдатаў. Справа ў тым, што тры гады таму сейм Польшчы адобрыў павышэнне пенсійнага ўзросту для мужчын і жанчын да 67 гадоў. І з 2013 года пенсійны ўзрост павялічваецца кожныя чатыры месяцы на адзін месяц. У выніку ўзрост выхаду на пенсію для жанчын падрасце да 67 гадоў да 2040 года, а для мужчын — да 2020 года.

—Пенсійны ўзрост трэба не павялічваць, а зніжаць, бо пенсіянеры забіраюць працу ў маладых, якія вымушаны ў пошуку заробкаў выязджаць у краіны Еўрасаюза, — выказваў сваю думку шматдзетны кандыдат.

— Працу, напрыклад, медсястры і настаўніцы, якім па 67 гадоў, нельга параўноўваць. Гэтае пытанне трэба дыферэнцыраваць у залежнасці ад прафесій і дапамагаць людзям шукаць у такім узросце іншую працу, пераводзіць на лягчэйшую, — прапаноўваліся варыянты выхаду з гэтай няпростай сітуацыі.

У апанентаў на гэты конт была іншая думка:

—Працяглaсць жыцця людзей павялічваецца, і хочам мы гэтага ці не, пенсійны ўзрост павялічваць прыйдзецца.

Спрашчаць і рабіць зразумелай сістэму падаткаабкладання, павялічваць падаткі для багатых і паніжаць для бедных — такія былі асноўныя тэзісы выступленняў кандыдатаў, датычныя пытання падаткаў.

Нечаканым падалася адкрытая прапанова аднаго з маладых і сур`ёзных кандыдатаў ад партыі КОРВіН узаконіць у Польшчы смяротнае пакаранне. Доводамі служыла тое, што вялікая колькасць злачынстваў тады не будзе здзяйсняецца з-за страху смерці.

Праблемы мясцовага маштабу

Другім раўндам дэбатаў сталі пытанні кандыдатаў адзін аднаму, а пасля пытанні змаглі задаць прысутныя ў зале. Выбаршчыкаў найперш хвалявалі праблемы мясцовага маштабу, у прыватнасці будаўніцтва ў Слупцы аперацыйнага блока, размовы пра які вядуцца ўжо з добры дзясятак гадоў. Непакоіць жыхароў фінансаванне школ — дзяцей меншае, адпаведна змяншаюцца выдаткі на адукацыю з бюджэту. Узніклі спрэчкі і наконт таго, у колькі гадоў павінны дзеці ісці ў школу. І калі адзін кандыдат-настаўнік выказваўся супраць таго, каб дзяцей аддавалі ў школу ў шэсць гадоў, бо ў такім узросце дзіця мае з-за гэтага шмат праблемаў, то яго калега выступаў за тое, што школу вучні павінны наведваць менавіта з 6-гадовага ўзросту.

Як лічаць жыхары Слупцы, трэба займацца і праблемай катастрафічнага змяншэння колькасці спецыялістаў, якіх рыхтуюць прафесійныя школы, — большасць паступае вучыцца ў ВНУ, а спецыялістаўрабочых, тых жа слесараў, сёння не хапае. Хвалюе палякаў і немагчымасць тэрмінова трапіць да вузкіх дактароў-спецыялістаў, і вялікія пенсіі тых, хто працаваў у часе папярэдняй сістэмы і прыгнятаў людзей, страта ранейшых рынкаў збыту з-за эмбарга і пошук новых, адмена прывілеяў для тых, хто служыць у паліцыі ці войску.

І хай сабе 2,5-гадзінныя дэбаты прайшлі без гарачых спрэчак і напалу жарсцяў, яны сталіся прыкладам таго, як павінна будавацца дэмакратыя ў грамадстве, бо дэбаты — абавязковы кампанент любога дэмакратычнага грамадства. Паказчык дэмакраты ў любой еўрапейскай, цывілізаванай краіне — гэта таксама і шматпартыйная сістэма.

Разам з тым палякі не баяцца адкрыта гаварыць пра праблемы выбарчага працэсу. Адна з іх — нізкая яўка на выбары, якая складае каля 40%. І тое, як прымусіць людзей ісці галасаваць і забяспечыць правільны падлік галасоў, выклікала клопат палітыкаў.

—Цяпер ідзе навучанне членаў камісіі. Найперш трэба сачыць за тым, каб пры падліку галасоў ні ў каго не было рук, — дзяліўся досведам кандыдат.

Пытанні, у сферы якіх палягалі спрэчкі палітыкаў, сёння хвалююць не толькі жыхароў суседняй краіны. Амаль усе гэтыя праблемы патрабуюць асэнсавання і вырашэння і ў нашым грамадстве. Адсутнічаюць хіба толькі дзве з іх — у беларусаў практыкуецца смяротнае пакаранне і на выбарах у нас галасуе да 91% насельніцтва.

Наталля ІВАНОВА
Фота аўтара



Кандыдаты і выбаршчыкі, г. Слупца

У аўторак, 27 кастрычніка, у Польшчы былі абвешчаны афіцыйныя вынікі нядзельных парламенцкіх выбараў. Згодна з лічбамі, апазіцыйная кансерватыўная партыя «Права і справядлівасць», якой кіруе былы прэм`ер-міністр Яраслаў Качыньскі, самастойна ўзначаліць урад. За гэтую партыю прагаласавала 37,58% выбаршчыкаў. Яраслаў Качыньскі — брат-блізнюк былога прэзідэнта Польшчы Леха Качыньскага, які загінуў у авіякатастрофе пад Смаленскам.

Яўка на парламенцкія выбары склала 50,92%. Гэта для Польшчы з`яўляецца добрым вынікам.



ПРОБЛЕМА

ВАША РАБОТА БУКВАЛЬНО ВАС УБИВАЕТ

"Многие любят ныть, что работа их убивает. Как ни трагично, для некоторых категорий населения США это похоже на правду", — сообщает Ана Суонсон в The Washington Post.



"Новое исследование, проведенное сотрудниками Гарварда и Стэнфорда, показало, на сколько лет работа, связанная с повышенным стрессом, урезает продолжительность жизни американцев. Выяснилось, что количество лет, потерянных из-за стресса, существенно различается для людей разных рас, неодинакового уровня образования и разных полов, причем разница доходит почти до трех лет в некоторых группах", — говорится в статье.

В рамках исследования выделили 18 групп населения по расе, образованию и полу. Затем выделили десять негативных факторов, связанных с работой: в частности, безработица, временные увольнения, отсутствие медицинской страховки, посменную работу, большую продолжительность рабочего дня, отсутствие гарантии занятости, конфликт между работой и семейной жизнью — и оценили влияние каждого из них на годовой уровень смертности и продолжительности жизни.

"Собранные данные показали, что люди с более низким уровнем образования гораздо чаще попадают на рабочие места с менее здоровыми рабочими практиками, сокращающими продолжительность жизни, — сообщает автор. — Некоторые из выделенных исследователями факторов сильнее влияли на продолжительность жизни, чем остальные. Во всех группах населения самое заметное влияние оказали такие факторы, как безработица и временные увольнения, а также отсутствие медицинской страховки".

"Исследователи делают ясный вывод: нужно усилить внимание к созданию более здоровых условий труда, особенно для менее образованных работников. Хорошая новость заключается в том, что способ добиться этого относительно прост. Исследователи полагают, что многие из проблем — слишком длинный рабочий день, работа в разные смены, отсутствие медстраховки и оплачиваемых отпусков, а также негарантированность занятости — могут быть отчасти решены посредством улучшения политики поддержки сотрудников", — резюмирует Суонсон.

Inopressa.ru

ОХРАНА ТРУДА

РАБОТОСПОСОБНОСТЬ И КАЧЕСТВО ВОЗДУХА ВЗАИМОСВЯЗАНЫ

Американские специалисты выявили связь между работоспособностью сотрудников и качеством воздуха в офисном помещении. Ученые выяснили, что хорошая вентиляция в несколько раз увеличивает качество работы сотрудников.

В исследовании оценивалось количество летучих органических веществ и углекислого газа с объемом воздуха, поступившего снаружи.

24 человека, среди которых инженеры, архитекторы и менеджеры по продажам, занимались своими обычными обязанностями, но в условиях различной вентиляции помещения.

Условия работы были разделены на три группы: обычный офис, «зеленый офис» и «зеленый офис с внешней вентиляцией». Участники эксперимента ежедневно проходили тестирования на уровень реакции и сообразительности.

После шестидневного исследования были подведены итоги. Согласно данным специалистов, результаты в «зеленом» здании на 61% превосходили итоги работы в обычном офисе. А дополнительная вентиляцию увеличивала это значение до 101%. На 97% лучше оказалась реакция на кризисную ситуацию в «зеленом офисе», а при дополнительном проветривании — на 131%.



На основании новых данных ученые рекомендуют организовывать работу коллектива на свежем воздухе, так как это приведет к росту производительности труда с минимальными затратами на электроэнергию.

MIGnews.com

РЕЦЕПТ

СЫРНЫЕ БЛИНЫ С ЗЕЛЕНЬЮ

Ингредиенты

200 г муки
300 мл воды
150 г твердого сыра
50 мл растительного масла
2 яйца
1 ч. л. соли
1 ч. л. сахара
1 ч. л. разрыхлителя
1 зубчик чеснока
1 небольшой пучок зелени

Приготовление

Смешай яйца, соль и сахар и взбей всё миксером на средней скорости до получения однородной массы. Затем добавь воду.

В отдельной емкости смешай муку и разрыхлитель и добавляй эти сухие ингредиенты в массу постепенно, при помощи миксера. Затем добавь растительное масло.

Натри сыр на терке и мелко нарежь зелень. Чеснок пропусти через чеснокодавилку. Добавь эти ингредиенты к тесту и тщательно перемешай лопаткой или ложкой.

Теперь можно начинать печь блины.

Такие сырные блины с зеленью не наскучат никогда, поэтому обязательно запиши этот рецепт в свою кулинарную книгу и расскажи о нём своим друзьям!

СОВЕТЫ СПЕЦИАЛИСТА

ДИЕТОЛОГИ РАССКАЗАЛИ, КАКИЕ СЛАДОСТИ ПОМОГАЮТ СОХРАНИТЬ ФИГУРУ В ФОРМЕ И УКРЕПИТЬ ЗДОРОВЬЕ

Диетологи рассказали, какие сладости помогают сохранить фигуру в форме и укрепить здоровье, пишут «Аргументы и Факты».



Мед, в отличие от конфет или пирожных, содержит очень много полезных веществ. Например, фолиевая и пантотеновая кислота, витамины B2, B3, B6, C, а также кальций, магний, железо, фосфор.

Черный шоколад (70% какао) содержит триптофан — аминокислоту, из которой образуется серотонин — источник хорошего настроения. Но следует обратить внимание на то, чтобы в составе шоколада не было пальмового масла. Его жиры организм не усваивает.

Зефир, конечно, не является диетическим продуктом из-за большого содержания сахара. Но из-за пектина — натурального сорбента, который выводит из организма токсические вещества и снижает уровень холестерина в крови, лучше съесть один зефир, чем кусок сладкого пирога.



В отличие от привычных сладостей в виде тортов и конфет, в сухофруктах присутствует клетчатка, витамины и микроэлементы. К примеру, финики, в которых находится большое количество углеводов, помогут восстановить силы во время напряженного рабочего дня.

Страницу подготовила Анна ВОЛОДАЩУК

РЭТРАФОТА






Пажар на Слонімскім вінзаводзе, які адбыўся ў траўні 1976 года. Так выглядала тэрыторыя завода пасля здарэння.

Наталля ІВАНОВА

КРЫЖАВАНКА

«БЕЛАРУСКІЯ ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ»

1. Датуль ... княгіня, пакуль поп не згіне.
2. Хоць ... гола, ды свая доля.
3. ... ваюе, а дзеці дома гаруюць.
4. Галоднаму і бульбіна ...
5. Вось вам і ..., і дуга, я вам болей не слуга.
6. У ... вады не льюць, а ў лес дроў не вязуць.
7. ... у карчме п`е і скача — гаспадарка плача.
8. Быў тут ..., ды забраў нястатак.
9. ... маўчыць, калі грошы гавораць.
10. ... на слёзы не глядзіць.
11. Кожнаму свой ... мілы.
12. Пан есць ..., а мужык — язык на акно.
13. То не ..., што не кусаецца.
14. ... абкрадзе — сцены застануцца, а жонка памрэ — усё з двара звязе.
15. Як выбіўся ў паны, то і ... стаў адчыняць нагою.
16. Хлеб і вада — мужыцкая ...
17. ... добрага роду: п`е гарэлку як ваду.
18. Любіў ... жабу, аж вочы выеў.
19. Каб пазнаць чалавека, трэба з ім ... солі з`есці.
20. Не той пан, у каго новы ...
21. Не судзіся з багатым: у яго кожны ... стане сватам.
22. Курыца — не птушка, гультай — не чалавек, ... — не гаспадар.
23. П`янаму ... вузкая.
24. ... не горш розуму.
25. Ад прыбытку ... не баліць.
26. Пад`еў, аж ... да спіны прыліп.
27. Не бяда, калі ў хлебе ..., тады бяда, калі хлеба няма.
28. Пад ляжачы ... вада не цячэ.
29. На яду ..., а на работу так-сяк.
30. Аднаму аж з ... прэ, а другі з галаду мрэ.
31. Як п`ян, дык ..., як праспіцца — свінні баіцца.
32. Тады ... добры, як спіць.
33. Бацька за ... — дзеці за пірог.
34. Не да каляд, калі ...
35. Хто бедным спагадае — чыстае ... мае.
36. Адна ... вясны не робіць.



АД УЛАДЗІМІРА ВАШУТЫ

Ответы на сканворд в №44

По горизонтали: «Динамо», лоток, Мальвина, финалист, енот, хи, ер, омофон, сова, Туров, трак, «Атас», Ант, форум, Родари, радар.

По вертикали: вокалист, Ильф, Новиков, сатин, монах, Севан, тракт, нота, омут, Тора, фосфор, Ора, град, ода, ура, мир.

ИЩУ ТЕБЯ

ПРОСЯТ ОТОЗВАТЬСЯ ЯНУШЕВСКИХ

Владислава Янушевская умерла в 1926 или 1927 году, похоронена на одном из кладбищ в Слониме.

Состояла в браке с военным — капитаном Яном Янушевским, имела дочку Янину.

Если у вас есть сведения о семье Янушевских, позвоните по телефону в редакцию 8 029 133-04-21.

P.S. Уважаемые читатели! Если Вы хотите найти кого-то из своих родных, друзей, знакомых, обращайтесь в нашу рубрику «Ищу тебя». Мы поместим Ваше послание на страницах «ГС», сайте издания и в соцсетях. А также обязательно пишите или звоните нам, если Вам что-то известно о людях, которых ищут в нашей рубрике: тел. 8 029 133-04-21, e-mail zhannapleshko@gmail.com

Полина ПЛЕШКО

ЗАГЛЯНЕМ У СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

ПРАЗ 100 ГАДОЎ ЗДЫМАК ВЯРНУЎСЯ НА РАДЗІМУ



Сям`я Сымона і Хрысціны Ракевіч, вёска Ваўчкі Слонімскага павета, 1900 год

Гэты здымак сям`і свайго дзеда днямі прынёс у рэдакцыю слонімскі настаўнік-пенсіянер Мікалай Ракевіч. Здымак зроблены ў 1900 годзе ў вёсцы Ваўчкі Слонімскага раёна, скуль паходзіць род Ракевічаў.

На здымку мы бачым Сымона Маркавіча Ракевіча (першы злева) з жонкай Хрысцінай Кандратаўнай (крайняя справа) з дзецьмі (злева направа) Вольгай, Зосяй і Мікалаем.

Перад пачаткам Першай сусветнай вайны, у 1913 годзе, гэты сямейны здымак узяў з сабой у эміграцыю ў Злучаныя Штаты Амерыкі Мікалай Сымонавіч Ракевіч. Мікалай застаўся ў ЗША, стварыў там сям`ю, у іх з жонкай нарадзіліся двое сыноў. Здымак сваёй сям`і з радзімы Мікалай захоўваў усё жыццё, а пасля яго смерці здымак застаўся ў яго сына Роберта.

І вось праз 100 гадоў пасля эміграцыі бацькі Роберт Ракевіч са сваёй сям`ёй прыехаў са Злучаных Штатаў у Слонім да свайго дзядзькі Мікалая Іванавіча Ракевіча. З сабой Роберт прывёз гэты здымак і падараваў яго Мікалаю Іванавічу.

Мікола КАНАНОВІЧ

Здымак з сямейнага архіва Мікалая РАКЕВІЧА

Старонку падрыхтавала Наталля ІВАНОВА

СЛОНИМСКИЕ ГИМНАЗИСТЫ ПОСМОТРЕЛИ, КАК ИЗГОТАВЛИВАЮТСЯ ИЗДЕЛИЯ ИЗ СТЕКЛА



Детей встретил необычный экскурсовод



Сражались на мечах



Фото на память



Знакомились со средневековым «Позорным столбом»

Ученики 4 «А» класса гимназии провели осенние каникулы с пользой.

Под руководством классного руководителя Ольги Гончарук и одной из мам, Татьяны Малец, дети побывали на стеклозаводе «Неман», который находится в городе Берёзовка. Они посетили производство, где увидели, как изготавливается стекло и что делают из стекла. Также посетили музей стеклозавода.

После этого ребята поехали в Лидский замок, где их встретил экскурсовод в необычном одеянии. Школьники совершили пешеходную обзорную экскурсию, а затем приняли участие в средневековых интерактивных играх на специализированных площадках.

Как отметили дети, экскурсия была познавательной и очень интересной.



В таких доспехах ходили рыцари



Дети стреляли из лука

ДЕТИ ПОДЕЛИЛИСЬ СВОИМИ ВПЕЧАТЛЕНИЯМИ

Даша:



— Мне больше всего понравилось представление в замке, как рыцари сражались на мечах. Затем они и нам дали подержать в руках меч.

Александра:




—Я стреляла из настоящего лука. Было сложно, но мне очень понравилось.

Максим:



—Я увидел, что и как изготавливают из стекла на заводе. Это супер. В замке мне понравилось наблюдать за дуэлью рыцарей. Ещё мы поднимались на башню.

Арсений:



—Мы посетили музей на стеклозаводе, там много красивых изделий. Во время экскурсии я узнал, что печь на стеклозаводе может работать до пяти лет, не останавливаясь.

Ваня:



—Я хорошо запомнил, что стекло плавится при температуре 1 350 градусов.

Денис:




—Мне понравилось смотреть, как из печи доставали стекло и обрезали его специальными ножницами. Затем мы увидели конечный результат — бокалы. Теперь, когда я смотрю на бокалы дома, я знаю, как они делаются, и рассказываю другим.

Настя:



—Меня впечатлила в Лидском замке средневековая комната пыток. А побывав на заводе, я узнала, как делаются стеклянные изделия. Было очень интересно.

Алёна:



—Всё очень понравилось и впечатлило. Мы видели, как интересно делаются стеклянные предметы. А ещё посетили музей.

Вика:



—У нас была весёлая компания — это наш дружный класс. Суперпоездка! Благодаря этим экскурсиям мы узнали много нового и интересного. Привезли много впечатлений и фотографий.

Фото из архива Татьяны МАЛЕЦ

Страницу подготовила Татьяна ПЛАХЕТКО
tanyaplahetko@gmail.com

Намеснік галоўнага рэдактара
Мікола КАНАНОВІЧ
Журналісты
Уладзімір ШУМЕЛЬ
Яўген ВАЛАДАШЧУК
Кацярына ЯНУШЭВІЧ
Таццяна ДЗЕНІСЮК
Алена КАСЦЮК
Стыль-рэдактар
Жанна ПЛЕШКО
Рэдакцыя сайта www.gs.by
Рэдактар
Дзмітрый МІЦКЕВІЧ
Спецыяліст па рэкламе
Наталля ЦАРОВА

Галоўны бухгалтар
Святлана ПРЫМАВА
Бухгалтар
Вольга БУРСЕВІЧ
Аддзел падпіскі і продажу
Аляксей НАВІЦКІ
8-(029) 322-06-42
Вёрстка і дызайн
Віталь ЕМЯЛЬЯНАЎ
Сяргей РЭКУН

Тэлефоны рэдакцыі:
т/факс: **8 (01562) 29-999,**
Тэл. 6-36-58, 6-36-68, 6-36-54, 6-36-44.
МТС: **8-029-584-87-32**
Velcom: **8-029-133-04-21**
Skype — gazslon
(9.00-18.00)
Для карэспандэнцыі:
231799, г. Слонім,
вул. Чырвонаармейская, д. 41
e-mail: gs@gs.by,
gazslon@gmail.com

Рэкламная служба
Начальнік рэкламнай службы
Ганна ВАЛАДАШЧУК
anna@gs.by
8-(029) 612-26-43
Супрацоўнікі
Наталля СТРУПАВЕЦ
Людміла КАМЯНЕЦКАЯ
Ірына ФРАНОВІЧ
8-(044) 715-90-03
8-(01562) 6-60-56
(9.00–16.00)
т/факс:
8-(01562) 29-000

Прыём аб'яў і падпіска:
г. Слонім, Чырвонаармейская, 73 Б
(будынак АРЗ)
Працуем аўторак — пятніца 9^{00}-17^{00}
субота — нядзеля 9^{00}-15^{00}
выходны — панядзелак
8-(044) 762-48-39

погода на неделю

	утро	день	вечер
СРЕДА, 4 ноября	4⁰	9⁰	7⁰
ЧЕТВЕРГ, 5 ноября	1⁰	7⁰	6⁰
ПЯТНИЦА, 6 ноября	3⁰	5⁰	5⁰
СУББОТА, 7 ноября	4⁰	6⁰	5⁰
ВОСКРЕСЕНЬЕ, 8 ноября	1⁰	5⁰	5⁰
ПОНЕДЕЛЬНИК, 9 ноября	7⁰	8⁰	7⁰
ВТОРНИК, 10 ноября	5⁰	7⁰	8⁰
СРЕДА, 11 ноября	8⁰	9⁰	7⁰

www.meteoprog.by

УРОЖАЙ

ТЫКВА-РЕКОРДСМЕН

Тыква, весом почти 30 кг, выросла на приусадебном участке по улице Суворова в Слониме. В сарай она была закачена, так сказать, своим ходом. Но для того, чтобы хоть какую-то часть завезти в Минск, Олегу Петровичу пришлось её рубить топором.

Что интересно, ни у соседей слева, ни у соседей справа подобных размеров тыквы не растут. Вроде и земля самая обычная, никаких особых удобрений. Тем не менее на участке Феклы Павловны Антоник такие тыквы растут не первый год. В этом году — из мощных и неподъемных — было две тыквы.

Владимир ШУМЕЛЬ
Фото предоставлено Анастасией ШЕСТАК



Вот такой урожай

РУКОВОДИТЕЛИ ВЫСЛУШАЮТ СЛОНИМЧАН ПО ТЕЛЕФОНУ

График проведения еженедельных субботних прямых телефонных линий руководством Слонимского райисполкома на ноябрь:

14 ноября — председатель Слонимского райисполкома Олег Таргонский.

21 ноября — заместитель председателя Слонимского райисполкома Владислав Гершгорин.

28 ноября — председатель Слонимского районного Совета депутатов Сергей Рогозик.

Об этом сообщается на сайте Слонимского райисполкома.

Напоминаем, что телефонные линии проходят по субботам с 9 до 12 часов, телефон 5-03-11.

Татьяна ПЛАХЕТКО

Дзякуй за тое, што выбралі "Газету Слонімскую"!

Галоўны рэдактар Віктар Уладзіміравіч Валадашчук, victor@gs.by

ЗАСНАВАЛЬНІК **Віктар Уладзіміравіч ВАЛАДАШЧУК**
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах

Рэгістрацыйнае пасведчанне №64 ад 05.03.2009 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Свидетельство о госрегистрации УП "Газета Слонимская" ЮКЛ № 001845, выданное Гродненским областным исполнительным комитетом от 03.04.2003 г.

email: gs@gs.by
gazslon@gmail.com
Юрыдычны адрас: 231800, г.Слонім, вул. Чырвонаармейская, 41
Тыраж 4010 экз.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)
Свабодны кошт

Час падпісання да друку па графіку 3 лістапада 2015 года 16:00.
Аб'ём – шэсць умоўных друкаваных аркушаў.

Надрукавана ў друкарні ГАУПП "Гродзенская друкарня" г.Гродна, вул. Паліграфістаў, 4, індэкс 230025.
Заказ № 6496